дзяў і рысяў, каб памерлыя з іх дапамогай лезлі на Г., на «суд Божы». «Вырай дзесь вельмі далеко на зямлі за гарамі да за марамі», — лічылі беларусы-палешукі. У хрысціянстве, як і ў язычніцтве, Г. звязана з блізкасцю Бога, таму ўшаноўваюцца Г. на Святой зямлі, згаданыя ў Бібліі (іх наведваюць і бел. паломнікі): Сінай, Фавор, Галгофа (заключаная ўнутры храма). Пад уплывам, відаць, германска-скандынаўскага фальклору Г. часам лічылася месцам знаходжання нячысцікаў (у казках — жытло Кашчэя ці Змея, дзе яны трымаюць прыгажуню — магчыма, персаніфікацыю лета). Так, на *Лысай гары* збіраліся ведзьмы і ведзьмакі. Многія абрады на Беларусі звязаны з узгоркамі: на іх адбывалася Гуканне вясны на Юр'я; катанне вогненных колаў на Купалле; запальванне вогнішчаў на Каляды; назіранне «ігры сонца» на Вялікдзень.

*Літ.:* Бяздоннае багацце: Легенды, паданні, сказы. Мн., 1990; Сержпутоўскі А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. Мн., 1998; Шамякіна Т.І. Міфалогія Беларусі: Нарысы. Мн., 2000; Беларуская літаратура XI—XX ст. Мн., 2001.

*Т. І. Шамякіна.*

**ГАРАВІ́К**, персанаж казак сюжэтнага тыпу СУС 513 А «Шэсць дзівосных таварышаў»; асілак, адзін з паплечнікаў асноўнага героя, якія дапамагаюць яму вырашаць цяжкія задачы, высватаць нявесту. Бел. казкі гэтага сюжэтнага тыпу запісалі Е.Раманаў, У.Дабравольскі. Г. (Гарыня, Гарынь-багатыр) валодае велізарнай сілай, здольны пераносіць з месца на месца горы. У запісанай Е.Раманавым казцы «Васька-папялышка» ён выходзіць супраць шматлікага варожага войска, «узяў на вілы гару, ды так усю сілу і закрыў». У аснове вобраза Г. і іншых дзівосных памочнікаў (*Апівала*, *Аб'ядала*, *Мароз* і інш.) даследчыкі бачаць адлюстраванне сувязей чалавека з навакольным светам, розныя формы яго ўзаемадзеяння з прыродай і яе стыхіямі.

*Тв.:* Бараг Л.Р. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мн., 1978. С. 81—82; Гл. таксама да арт. *Аб'ядала*.

*К. П. Кабашнікаў.*

**ГАРАДНІ́ЦКІ** Яўген Андрэевіч (н. 29.7.1951, в. Ракаў Валожынскага р-на), літаратуразнавец, крытык, паэт. Кандыдат філалагічных навук (1995). Скончыў БДУ (1971). Даследуе тэарэтычныя аспекты ўзаемадзеяння фалькл. і літаратурнай паэтыкі, спецыфіку фалькл. мыслення, сістэму фалькл. вобразнасці і яе ўплыў на паэтычную творчасць. У кн. «Сучасная паэзія і фальклор» (з Т.Чабан, 1988) разглядае тыпалогію міфалагічнага светаадчування, своеасаблівасць яго выяўлення ў фальклоры і бел. паэзіі 2-й паловы 20 ст., трансфармацыю старажытных анімістычных поглядаў на свет у творчасці буйнейшых сучасных паэтаў. Распрацоўвае канцэпцыю стадыйнага развіцця мастацкай свядомасці, паступовага пераходу ад міфа да метафары як асноўнага сродку вобразатворчасці і пабудовы паэтычнага дыскурса. Пры гэтым ім адзначаецца актуальнасць міфалагічнага светаўспрымання і для сучаснай літаратуры. Даследуе спецыфіку мастацкага мыслення, сувязь светапоглядных канцэпцый з вобразным ладам літаратурных твораў. Звяртае ўвагу на ролю нар. мастацкіх архетыпаў, паэтычных сімвалаў у працэсе выяўлення філасофска-псіхалагічных асноў літаратурнай творчасці. Разглядаючы вершы Я.Купалы, падкрэслівае блізкасць многіх вобразаў і мастацкіх прыёмаў песняра да паэтыкі вуснай нар. творчасці. Сувязь фалькл. і паэтычнай вобразнасці аналізуе ў манаграфіі «Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы» (1986) і інш. У яго паэтычнай творчасці таксама выяўляюцца тыпалагічныя прыкметы фалькл. паэтыкі (вершы «Доля», «Адспявала жалейка...»).

*У. А. Васілевіч.*

**ГАРАДСКІ́ ФАЛЬКЛО́Р**, вусна-паэтычная творчасць гарадскога насельніцтва. У фарміраванні яго значную ролю адыгрывалі вяскоўцы, якія доўгі час, асабліва ў невялікіх гарадах, захоўвалі многія рысы сялянскага побыту, каляндарныя і сямейныя святы, паэзію. Традыцыйна адзначаліся Хрэсьбіны і Вяселле, Каляды, Масленіца, Сёмуха (Тройца), Купалле. Г.ф. бытуе ў асяроддзі розных сацыяльных і прафесійных груп. У дарэвалюцыйны час на Беларусі значнае месца ў Г.ф. займала паэтычная творчасць рабочых: песні «Жыццё маё нялёгкае», «Нас сагналі сюды», «Не па ўласнай мы ахвоце», «Раз было я замарыўся», сатырычныя прыпеўкі, вусныя апавяданні, анекдоты. Быў пашыраны гарадскі ра-